

У апошні месяц года адзначаем ***85-годдзе Івана Гаўрылавіча ЧЫГРЫНАВА —*** народнага пісьменніка Беларусі, драматурга, грамадскага дзеяча..

Чыгрынаў - лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, лаўрэат літаратурнай прэміі імя А.Фадзеева, Кавалер Ордэну Дружбы народаў, Ганаровы грамадзянін г. Касцюковічы.

Іван Чыгрынаў працягнуў справу Кузьмы Чорнага, Івана Мележа, Васіля Быкава ў стварэнні народнага эпасу, які дакладна выяўляе нацыянальную душу беларусаў, іх менталітэт. Ён так, як і ўзгаданыя вышэй зубры беларускай літаратуры, грунтоўна выпісаў Беларусь і беларусаў у віры розных падзей: у часы сівой даўніны, у гады ваеннага ліхалецця, у часы пасляваеннай галечы і ў няпростыя 80-90-я гады XX стагоддзя. Яго героі адначасова звычайныя і незвычайныя людзі, якіх мы сустракаем у паўсядзённым жыцці, з якімі мы жывём побач.

Іван Чыгрынаў з’яуляецца аўтарам шматлікіх апавяданняў, раманаў, п'ес, кінасцэнарыяў, крытычных і публіцыстычных артыкулаў.

Іван Гаўрылавіч пражыў цікавае і няпростае жыццё. З'явіўся на свет будучы мастак слова **21 снежня 1934 года** у вёсцы Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна, што на Магілёўшчыне. У сваёй аўтабіяграфіі пісьменнік так выказваў любоў да малай радзімы: “Мясціны гэтыя дарагія для мяне не толькі тым, што адтуль, з бацькоўскага парога, уецца сцяжынка майго жыцця. Там, у Забесяддзі, на Магілёўшчыне, назаўсёды засталіся сляды маіх герояў, жывых і мёртвых, пра якіх я расказваю у раманах”.

Гадаваўся будучы пісьменнік ў звычайнай працавітай сялянскай сям'і: бацька – старшыня сельсавета, маці –калгасніца. Пазней Іван Чыгрынаў з вялікай удзячнасцю ўспамінаў маці Хадоску Ігнатаўну, на плечы якой клаўся ўвесь цяжар па выхаванні васьмярых дзяцей.

Дзяцінства Івана Гаўрылавіча, як і многіх іншых пісьменнікаў таго пакалення, было апалена вайной. Перажытае ў гады ваеннага ліхалецця і нялёгкі пасляваенны час потым было таленавіта адлюстравана ім у апавяданнях **"Бульба", "За сто кіламетраў на абед", "Ішоў на вайну чалавек", "У ціхім тумане", "У баку ад дарогі", раманах "Плач перапёлкі", "Апраўданне крыві"** і іншых. Сам мастак слова так акрэсліў месца вайны ў сваёй біяграфіі: "У вайну хапіла ўсім – і дарослым, і дзецям... На вайну прыпала толькі тры няпоўныя гады майго жыцця, але якраз яна стала галоўнай падзеяй, якая вызначыла на доўгі час маю творчасць".

Дарога да ведаў пачалася яшчэ ў даваенны час: у 1940 годзе хлопец пайшоў у першы клас. Вайна перапыніла вучобу, але пасля вызвалення

Магілёўшчыны ад фашыстаў Іван зноў сеў за школьную парту. Пасля заканчэння Вялікаборскай сямігодкі Іван Чыгрынаў вучыцца ў Саматэвіцкай сярэдняй школе, якую раней закончыў яшчэ адзін народны пісьменнік Беларусі — Аркадзь Куляшоў, якога зусім нядаўна (у лютым гэтага года) я прыгадвала ў сувязі з юбілеем.

Той факт, што ў роднай школе некалі вучыўся аўтар паэмы "Сцяг брыгады", як прызнаваўся сам Іван Гаўрылавіч, прымушала вельмі адказна ставіцца да вучобы і абудзіла жаданне паспрабаваць свае сілы ў літаратуры.

Яшчэ ў школе юнак захапіўся літаратурай, пачаў сам пісаць вершы, таму невыпадкова, што жыццёвы шлях прывёў яго на аддзяленне журналістыкі філфака БДУ, дзе ён пазнаёміўся з маладымі і таленавітымі літаратарамі. Аднакурснікамі Івана Чыгрынава былі Іван Пташнікаў, Вячаслаў Адамчык.

Больш за тры дзесяцігоддзі напружанай творчай працы наканаваў яму лёс. У друку ён дэбютаваў вершам у 1952-м, як празаік — у 1958-м у газеце “Чырвоная змена”.

Сам мастак слова лічыў пачаткам сталай літаратурнай дзейнасці 1961 год, калі ў штотыднёвіку "Літаратура і мастацтва" з'явілася апавяданне "Праз гады".

Іван Гаўрылавіч працаваў на розных пасадах у рэдакцыях выдавецтва "Навука і тэхніка" АН Беларусі, часопіса "Полымя, працяглы час быў на кіруючых пасадах Саюза пісьменнікаў Беларусі (1975-1986), у складзе дэлегацыі Беларусі ўдзельнічаў у працы XXXIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1978), з 1987 года — старшыня праўлення Беларускага фонду культуры, з 1989 года — галоўны рэдактар часопіса "Спадчына".

На літаратурнай ніве І. Чыгрынаў паспеў зрабіць многае, за што заслужана ў 1994 годзе атрымаў званне народнага пісьменніка Беларусі. Ён стаў аўтарам зборнікаў апавяданняў **"Птушкі ляцяць на волю", "Самы шчаслівы чалавек", "Ішоў на вайну чалавек".** Аднак І. Чыгрынаў больш вядомы як пісьменнік-раманіст, які пераканаўча адлюстраваў драматычныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны, аб чым красамоўна распавядае пенталогія, якая складаецца з раманаў: **"Плач перапёлкі", "Апраўданне крыві" "Свае і чужынцы" "Вяртанне да віны", "Не ўсе мы згінем".** За першыя дзве часткі ў 1979 годзе аўтар быў уганараваны літаратурнай прэміяй імя А. Фадзеева.

Паводле трох раманаў у 1991 годзе на кінастудыі "Беларусьфільм" рэжысёр І. Дабралюбаў зняў шматсерыйны тэлевізійны фільм "Плач перапёлкі", дзе, між іншым, здымаўся і наш з вамі зямляк - Андрэй Бубашкін.

Іван Чыгрынаў выявіў сябе і як таленавіты драматург — аўтар п'ес "Дзівак з Ганчарнай вуліцы", "Следчая справа Вашчылы", "Чалавек з мядзведжым тварам", "Звон — не малітва" і інш.

Сэрца гэтага таленавітага мастака слова спынілася 5 студзеня 1996 года, пахаваны на Усходніх (Маскоўскіх) могілках Мінска.

Творчасць Івана Чыгрынава — яркая старонка ў беларускай прозе. Ён умеў глыбока пранікнуць у свет чалавека, узняць значныя праблемы, цудоўна валодаў майстэрствам пісьменніка.

Пасля чарнобыльскай трагедыі ў 1986 годзе маленькая радзіма І. Чыгрынава, як і А. Куляшова (і мая радзіма таксама) была атручана радыяцыяй, што прынесла незагойную рану ў сэрца пісьменніка.

А яшчэ адзін мой зямляк - Алесь Пісьмянкоў - прысвяціў калегу па творчасці верш "Вялікі Бор", у якім выяўляецца трагедыя спакутаванай беларускай зямлі:

Над Вялікім Борам –
Над вялікім горам
Плача ў небе жораў.
Над палын-травой,
Над зямлёй сівой
Плач праносіць свой.

***Паважаныя мае суразмоўцы, чытайце беларускую літаратуру. Гэта дапаможа вам зразумець продкаў, пранікнуцца пачуццём павагі да звычак, традыцый і лёсу беларусаў.***

***І тады мы з вамі пачнем саромецца свайго сарказму ў дачыненні да радзімы***